PolotskSU



УДК 94(476)“17\18”

# РЭЕСТР ГРАШОВЫХ ЗАТРАТ НА СЕЙМ 1764 Г. З АСАБІСТАГА АРХІВА ЗІБЕРГАЎ-ПЛЯТЭРАЎ, ЯК КРЫНІЦА ПА ПАЎСЯДЗЁННАЙ КУЛЬТУРЫ ШЛЯХТЫ XVIII ст.

*Р. М. УЛАСЕВІЧ*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*На примере реестра денежных затрат на элекционный сейм 1764 г. из личного архтва Зибергов-Плятеров показана возможность использования материалов статистического характера для изучения повседневной культуры шляхты XVIII ст. На примере данного реестра рассмотрен процесс подготовки к сейму одного из представителей рода Зибергов, в ходе которого автор источника производил различные покупки и давал определённые поручения по подготовке транспортных средств и слуг для отправки на сейм. Сведения из реестра дают возможность показать повседневный быт на протяжении поездки. Так же в статье на частном примере показаны изменения в повседневной культуре шляхты данной эпохи. Автор реестра придерживался «немецкого» или «французского» костюма, а его гардероб и аксессуары содержали элементы не характерные для традиционного шляхетского костюма XVIII ст.*

Пад час даследавання паўсядзённай культуры шляхты даследчыкі ў асноўным звяртаюцца да крыніц асабістага паходжання, а менавіта мемуарнай літаратуры, эпістальярных крыніц, нататак і інш.  Прыкладам можа служыць манаграфія А. І. Мальдзіса “Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў” пабудавана на аналізе мемуарнай літаратуры [2]. Пры гэтым у працы адзначаецца: “Мемуарная літаратура, зразумела, не дае і не можа нам даць “усю праўду” пра XVIII стагоддзе. У ёй ёсць велізарныя прагалы – слаба паказана жыццё сялянства, амаль адсутнічае горад” [2, с. 256]. На падставе нататак і мемуарыстыкі падарожнікаў, якія праяжджалі праз Беларусь паказана жыццё нашага краю ў манагарфіі А. І. Мальдзіса і В. Грыцкевіча “Шляхі вялі праз Беларусь”[1].

Насучасным этапе даследвання паўсядзённага жыцця шляхты спектар крыніц пашыраецца. У якасці прыклада можна прывесці артыкул беларускага этнографа С.А. Шыдлоўскага “Шляхецкі этас у творах А. Міцкевіча і Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня". У дадзеным артыкуле даследчык робіць спробу на падставе літаратурных твораў А. Міцкевіча і Я. Баршчэўскага вызначыць норавы і рысы шляхецкіх паводзін. Свае погляды на дадзеную праблематыку аўтар будуе на такіх творах, як “Пан Тадэвуш” і “Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях” [7]. Шырокі спектар крыніц пад час даследвання гендэрных узаемаадносін і паўсядзённага жыцця шляхты выкарыстоўвае у сваіх даследаваннях Н.У. Сліж [5, 6].

Калі разглядаць польскую гістарыяграфію, то і ў ёй мемуарыстыка з’яўляецца асноўнай крыніцай пры даследаванні паўсядзённага жыцця шляхты. Фундаментальная праца па вывуччэнню мемуарыстыкі як крыніцы была праведзена польскім гісторыкам

PolotskSU



А. Сайкоўскім. Вынікам даследвання стала манаграфія “Nad staropolskimi pamiętnikami”, якая была выдадзена у 1964 годзе [12]. Польскія даследчыкі пад час вывучэння паўсядзённасці шляхты выкарыстоўваюць як матэрыялы асабістага паходжання так і іншыя крыніцы. Напрыклад, Б. Папёлэк, у артыкуле “Rytmy życia. Codzienność i święto wgazetach rękopiśmiennych czaców saskich” на падставе тагачаснага перыядычнага друку робіць спробу прааналізаваць усведамленне свята і паўсядзённага ў чалавека той эпхоі [11]. У артыкуле “Miasto wita króla. Ceremoniał i jego rola komunikacyjna w diariuszach Adama Naruszewicza (1784, 1787)” А. Наркоўская аналізуе такі бок культурнага жыцця, як візіты Станіслава Аўгуста Панятоўскага па мястэчках і гарадах Рэчы Паспалітай. Крыніца для даследавання дадзенай праблемы, – успаміны Адама Нарушэвіча [10]. Е. Дыгдала ў артыкуле “Z życia towarzyskiego polskich elit szlachecko-magnackich w Gdańsku w połowie 1757 roku”. На падставе эпісталярных крыніц і матэрыялаў перыядычнага друку аўтар малюе карціну таварыскага жыцця эліт, якія прыбывалі ў Гданьск у першай палове 1757 г. [8].

Асноўныя крыніцы для вывучэння паўсядзённага жыцця шляхты – мемуарыстыка і эпісталярныя крыніцы. Тым не менш, аналіз матэрыялаў хатняга справаводства, уліковых матэрыялаў і справаздач, якія ўтрымоўваюць статыстычныя звесткі дазваляюць убачыць паўсядзённае жыццё скрозь патрэбы, рычы і дзеянні, якія ажыццяўляў чалавек.

Рэестар грашовых затрат на сейм 1764 г., які захоўваецца ў фондзе Зібергаў-Плятэраў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску складаецца з 12 частак, у якіх апісваецца паездка на элекцыйны сейм прадстаўніка з рода Зібергаў альбо Плятэраў, якія мелі свае ўладанні ў Ліфляндскім ваяводстве. У рэестры няма прамых звестак пра складальніка і аўтара крыніцы. Аднак, ускосна можна меркаваць, што дадзеныя прыведзеныя ў справаздачы можна аднесці да інфляндскага кашталяна і ваяводы Язафата Зіберга (памёр у 1776 г.) [13, с. 17]. Таксама на сейм 1764 г. мог адправіцца сын Я. Зіберга Ян Тадэвуш Зіберг (памёр у 1806 г.), які займаў высокія пасады ў Ліфляндскім ваяводстве [13, с. 12]. Варта адзначыць, што дакументы фонда Зібергаў-Плятэраў захоўваюць матэрыялы прадстаўнікоў абодвух шляхецкіх фамілій. Гэта ў сваю чаргу стварае дадатковыя складанасці з ідэнтыфікацыяй аўтарства крыніцы.

Як было адзначана вышэй рэестар складаецца з дванаццаці частак у якіх пазначаны грашовыя затраты пад час паездкі, прыбыцця і вяртання з элекцыйнага сейма 1764 года. На падставе дадзеных звестак можна рэканструяваць дэталі гэтага падарожжа і прасачыць у дробязях працэс падрыхтоўкі да яго.

Першыя часткі рэестра прысвечаныя набыццю коней і транспартных сродкаў. Для падарожжа, аўтар рэестра набыў у Зэльве гнядога жарабца за 130 чырвоных злотых і двух коней у Варшаве – цёмна-гнядога і каштанавага агулам за 125 чырвоных злотых. Адпаведна для коней былі набытыя сёдлы, воз, скура для абіцця воза, шоры, мундштукі, заказаны для выраб сёдлы. Акрамя вышэй пералічанага, былі выдаткаваныя грошы на “абслугоўванне коней”. Напрыклад, кавалю за рамонт воза і падкоўку коней было заплачана 51 прускі і 1 чырвоны злотых. Акрамя гэтага, шляхціц карыстаўся паслугамі канавала, які “удасканаліў коней” за 6 прускіх злотых і 20 грошай. Таксама ў канавала былі набыты лекі “на рослага жарабца” [3, арк. 16]. Воз, сёдлы і коні павінны былі быць

PolotskSU



упрыгожаны разнастайнымі стужкамі, шнуркамі і фрэнзялямі. У адпаведнасці з звесткамі занесенымі у рэестар яны былі срэбнага і залатога колеру [3, арк. 16 адв.].

Суправаджэннем шляхціца ў дарозе павінны былі займацца маштальеры (лакеі – аўт.). Абавязкам маштальераў быў дагляд за конямі і возам у адсутнасць гаспадара. Маштальеры выконвалі рэпрэзентатыўную функцыю. Іх знешні выгляд, паводзіны адлюстроўвалі статус асобы якой яны служаць. Акармя маштальераў ў прыслугу уваходзілі "стангрэт (кучар – аўт.) Юзэф" і "кухар Юрка". У адпаведнасці з рэестрам адзеннем для маштальераў займаўся кравец Шэпсель. На пашыў адзення і іншыя рэчы было выдаткавана 234 прускіх злотых. Паюкі і маштальеры павінны былі быць апрануты ў маштальерскія барвы. Галаўным уборам былі шапкі. Кожны маштальер меў шаблю на рамні і новыя боты [3, арк.17 адв.].

Сам гаспадар быў апрануты ў французскі альбо нямецкі строй. Гэта вынікае з гардэробу і рэчаў, якія пералічаны ў адпаведным раздзеле рыестра. Шляхціца суправаджаў камердынер Габрыельскі, які займаўся гардэробам і фрызурай свайго Пана. Фрызаванне праз тры дні абыходзілася ў 4 польскіх і 16 прускіх злотых [3, арк. 17 адв.] Таксама былі выдаткаваны сродкі на галенне – 7 прускіх злотых. Гардэроб складаўся з 3 сукняў, якія былі пашытыя ў немца краўца и трох пар ботаў. Акрамя гэтага, аўтар рэестра меў у сваім гардэробе розную бежутэрыю і аксэсуары. Былі набытыя пудра, памада (для валасоў – аўт), два парыкі, грэбень, банты на какарду і шпількі для валасоў. Таксама шляхціц меў лядунку і кнігі з алоўкам. Чысткай адзення займалася "прачка". На выдаленне плямаў, мыццё хустачак і манжэтаў быў затрачаны 41 прускі злоты. [3, арк. 16 адв.-18].

Такім чынам, сабраўшы гардэроб, рэчы і прыслугу шляхціц мусіў адпраўляцца ў дарогу. Шлях пралягаў з "дому" да Вільні і з Вільні да Варшавы. На гэта было выдаткавана 150 прускіх злотых, за якія былі нанятыя коні і фурманы для праезду ў Варшаву.

Кожны шляхціц, які прыбываў на сейм, павінен быў мець "станцыю", альбо "рэзідэнцыю". На месцы пастою загадзя нарыхтоўваўся "аброк" для коней і іншыя прыпасы. Тэрмін "станцыя" нярэдка згадваецца ва ўспамінах Марціна Матушэвіча, які прымаў актыўны ўдзел у палітычным жыцці і апісаў побыт шляхты на сойміках і соймах. Напрыклад, мемуарыст згадваў: "Пасля сарванага сейміка разышліся мы на абеды. Таго дня, пад вечар, прыйшоў да нас Сасноўскі пісар літ. З візітам: – сталі мы ў дамініканаў. Былі мы шчаслівыя, пачалі напівацца, частаваць яго, а потым Сасноўскі запрасіў нас да сябе на вячэру. Пайшлі мы з ім, цэлай кампаніяй нашай, пакінуўшы станцыю. Хадзіў з намі Сасноўскі па розных іншых візітах, так далёка, што іншыя з нашай кампаніі заставаліся і ўжо малой кампаніяй пайшлі да Сасноўскага" [9, с.5]. Такім чынам "станцыя" была месцам пастою і месцам дзе шляхціц прымаў і частаваў іншых.

У сваю чаргу аўтар рэестра загадзя набыў у ксянза Скарульскага аброк для коней і сена. Рэзідэнцыя ў Варшаве цягнулася тры тыдні. За гэты перыяд на кухню, піва, страўнае людзям, а таксама на аброкі, сена і дровы было выдаткавана 768 прускіх злотых і 10 грошай. Звычайна "аброк" на станцыю нарыхтоўваўся загадзя. Падобныя звесткі можна адшукаць у сямейнай карэспандэнцыі Яленскіх, якія займалі высокія псады ў Навагрудскім ваяводстве, Галоўным і Духоўным трыбуналах ВКЛ. Напрыклад, перад гродзенскім сеймам 1753 г. Рафал Яленскі ў адным з лістоў да брата Міхала Яленскага пісаў наступ-

PolotskSU



нае: “Зараз жа братка Дабрадзей пішы да ЯП Караля да Доргуня, каб своечасова … для ЯП Падчашага і для ЯП Гараднічага для ўсіх стараўся аб выгаднай ў Гродне станцыі … зправадзіў сена, сечкі, аброка, дрэва, піва і гд. … за што грошы вернем. Я дасць Бог за тыдні тры выеду адгэтуль да Доргуня, потым да Гродна паспяшаюся” [4, арк. 15-16]. Акрамя вышэйпералічанага аўта рэестра выдаткоўваў грошы на вянгерскае віно, англійскае піва, мёд трайняк, гарбату, цукар, каву і гданьскую гарэлку агулам 104 прускіх злотых [3, арк. 18].

Зваротны шлях пралягаў праз Тыкоцін, Гродна і Вільню. Пад час вяртання шляхціц карыстаўся паслугамі фурамана Юзэфовіча за правоз з Варшавы да Тыкоціна, а таксама паслугамі “тыкоцінскіх жыдоў” за правоз з Тыкоціна да Гродна. На адваротным шляху аўтар рэестра меў двухтыднёвую “рэзідэнцыю” ў Вільні. У выніку, дадзеная паездка каштавала шляхціцу 285 чырвоных злотых і 154 талеры і 6640 прускіх злотых і 20 грошай [3, арк. 18 адв.].

Такім чынам, звесткі з рэестра маюць дастаткова падрабязны характар і могуць трапна дапаўняць факты з іншых крыніц. Матэрыялы падобнага характару дэталёва адлюстроўваюць штодзённыя патрэбы чалавека і паказваюць паўсядзённае жыццё асобы за пэўны перыяд часу. Дадзены рэестар цікавы і тым, што ён дае магчымасць убачыць штодзённасць шляхціца новай эпохі, які носіць нямецкі альбо французскі строй, парыкі, панчохі, выдаткоўвае сродкі на парыкмахера, пудру і іншыя аксэсуары, які былі б не зразумелыя для шляхціца “сармата”.

ЛІТАРАТУРА

1. Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь: Нарыс / В. Грыцкевіч, А. Мальдзіс – Мінск: Маст. літ., 1980. — 272 с.
2. Мальдзіс, А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў / А. І. Мальдзіс. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 256 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). – Ф. 1503. Воп. 1. Спр. 117. Рахункі графоў Зібергаў за розныя тавары ў Варшаве.
4. НГАБ. – Ф. 1636. Воп. 1. Спр. 120. Перапіска паміж членамі сям’і Яленскіх.
5. Сліж, Н. У. Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI—XVII стст. / Н. У. Сліж. – Смаленск: Інбелкульт, 2015. – 672 с.
6. Сліж, Н. У. Гендэрна – ролевыя функцыі шляхіца ў сям’і і грамадстве Вялікага княства Літоўскага / Н. У. Сліж // СОЦІУМ Альмонах соціальной історії. – 2005. – Вып. 5 – С. 165 – 184.
7. Шыдлоўскі, С. А. Шляхецкі этас у творах А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш” і Я. Баршчэўскага "Шляхціц Завальня" / С. А. Шыдлоўскі // Actaalbaruthenica: Навуковы зборнік. Выпуск пяты. – Мн.: Права і эканоміка, 2005. – 284 с .– С. 177–182.
8. Dygdała J. Z życia towarzyskiego polskich elit szlachecko-magnackich w Gdańsku w połowie 1757 roku (Przebendowcy, Adam Kazimierz Czartoryski i wieku innych) / J. Dygdała / Przyjemność w kulturze epoki rozumu, red. T. Kostkiewiczowa, Warszawa 2011, s. 207-219.

PolotskSU



9. Matuszewicz, M. Pamiętniki Marcina Matuszewizca kasztelana Brzeskiego-Litewskiego 1714 – 1765: 1-4 t. / M. Matuszewicz. – Warszawa: wyd. A. Pawiński, 1876. – T. 3. – 220 s.
10. Narkowska, A. Miasto wita króla. Ceremoniał i jego rola komunikacyjna w diariuszach Adama Naruszewicza (1784, 1787) / A. Narkowska //Literatura i rytuały. – 2010. – XVI. – S. 237-254.
11. Popiołek, B. Rytmy życia. Codzienność i święto wgazetach rękopiśmiennyc hczaców saskich / B. Popiołek // Rocznik Historii Prasy Polskiej. – 2013, – №16 – S. 5 – 18.
12. Sajkowski, A. Nad staropolskimi pamiętnikami / Al. Sajkowski. – Poznań, 1964. – 147 s.
13. Wolff, J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. 1386–1795 / J. Wolff. — Kraków: W drukarni Wł.L. Angzyca i spółki, 1885. – 361 s.

REGISTER THE CASH COST OF THE DIET IN 1764 FROM THE PERSONAL ARCHIVE SBARGE-PLATER FAMILY, AS A SOURCE ON EVERYDAY CULTURE OF THE NOBILITY OF THE XVIII CENTURY

*R. ULASEVICH*

*In the article, the example of the register of monetary costs for the Election Seim of 1764 from the personal archives of Zyberg-Plater showed the possibility of using statistical materials for studying the everyday culture of the nobility of the 18th century. On the example of this register, the process of preparing for the Seym of one of the representatives of the Zyberg family, during which the author of the source made various purchases and gave certain instructions for the preparation of vehicles and servants to be sent to the Seimas, is considered. Information from the register gives an opportunity to show everyday life during the trip. Also in the article, on a particular example, the changes in the everyday culture of the szlachta of this era are shown. The author of the register adhered to the "German" or "French" costume, and his wardrobe and accessories contained elements not characteristic of the traditional gentry costume of the XVIII century.*